Асобы

ЯКУБ КОЛАС І ІВАН ШАМЯКІН

У канцы 1920 – пачатку 1930-х гг. у невялічкай леснічоўцы на Гомельшчыне адбылося знаёмства, праўда, спачатку завочнае, Івана Шамякіна з Якубам Коласам. Дакладней, з яго творчасцю і найвыдатнейшай паэмай "Новая зямля" класіка беларускай літаратуры. Бацька будучага пісьменніка Пятро Мінавіч Шамякін прынёс невядома адкуль дахаты кнігу без вокладкі. Вось як пісаў пра гэта Іван Шамякін ва ўспамінах "Сустрэчы з настаўнікам", якія ўбачылі свет у 1959 г.: "*А потым у хаце паявілася другая кніжка – бацька прынёс яе з канторы лясніцтва, мабыць, употай узяў у чырвоным кутку ці, можа, пазычыў у каго-небудзь з маладых служачых. Нас, малых, яна мала зацікавіла. Здаецца, у кніжцы не было нават вокладкі і – добра помню – ніякіх малюнкаў. Але вось аднойчы нехта з леснікоў пачаў уголас чытаць гэту кніжку. І ўсе змоўклі, услухаліся – і дарослыя, і мы, малыя. Да таго часу я глядзеў на кніжку як на нешта недасягальна мудрае і незразумелае. Ды, напэўна, і малапісьменныя леснікі былі амаль гэтакай жа думкі. І раптам – о цуд! – усё так проста, ясна, аб тым, што акружала нас. Помню, мы з братам ад задавальнення заліваліся смехам над радкамі з паэмы (між іншым, радкі гэтыя запомніліся з таго часу):*

А на дубах, як шапкі тыя,
Чарнеюць гнёзды буславыя,
Буслы клякочуць, бусляняты
Пішчаць жалобна, як шчаняты…
…А збоку чмыша бык Мікіта,
Хвастом махаючы сярдзіта…

Смешна было ад таго, што ўсё сапраўды, як у нас, і мы, слухаючы, уяўлялі сваіх буслоў на дубе і свайго бычка наравістага, гарэзлівага, шкадлівага.

Леснікам больш падабаліся мясціны пра зямлю і службу леснікову. У тыя гады гэта былі, як правіла, маладыя людзі, дзеці малазямельных сялян, якім мала што заставалася пры раздзеле бацькавых гаспадарак, і яны шукалі працы ў лесе" [2, с. 1 – 2].

Бацька будучага пісьменніка потым заўсёды насіў кнігу з сабой у сумцы і, безумоўна, чытаў яе ў лесе. Часам на папрокі жонкі, што няма дапамогі па гаспадарцы, Пятро Мінавіч адказваў радкамі з паэмы. А для дзяцей вечары, калі чытаўся твор, здаваліся сапраўдным святам. Але, відаць, кніга не мела канца, бо смерць Міхала Іван Пятровіч не памятаў.

На вялікі жаль, кнігу выпрасіў адзін з маладых леснікоў і не вярнуў.

А Іван Пятровіч потым толькі ў школе даведаўся, што паэму напісаў Якуб Колас і што называецца яна "Новая зямля".

Захапленне паэмай І. Шамякін пранёс праз усё жыццё, пра што пазней напісаў у дзённіках "Роздум на апошнім перагоне": «*Ці я перажыў той час, калі хочацца ўспамінаць маленства, юнацтва, ці яшчэ не дажыў да таго? Мне даўно хацелася нешта напісаць пра сваё лясное дзяцінства. Але адчуваю, не магу, чагось не хапае. А можа, перашкаджае такі шэдэўр, як "Новая зямля"? У апісанні жыцця лесніка, няхай сабе і савецкага перыяду, нельга не паўтарыць Коласа. Але лепш не напішаш. Гэта ўнікальны твор, магчыма, адзіны ў гэтым родзе ў сусветнай літаратуры*» [1, с. 19]. Яшчэ: «*Перачытваю "Новую зямлю". Геніяльная кніга! Столькі ў ёй таго, што знаёма мне! Хацеў было напісаць аповесць аб сваім лясным маленстве. Але ўспомніў "Новую зямлю"… Лепш не напішаш! Безумоўна, час іншы. Але ў 20-я і нават 30-я гады служба мала чым адрознівалася ад службы Міхала*» [1, с. 39]. Ці: «*"Новая зямля" сапраўды шэдэўр нашай класікі, гэты твор непадуладны часу, палітычным вятрам*» [1, с. 472].

Знаёмства І. Шамякіна з Якубам Коласам не было толькі завочным. Упершыню асабіста Іван Пятровіч сустрэўся з беларускім класікам у 1949 г. Дагэтуль бачыў яго на пісьменніцкіх сходах, пленумах, чуў выступленні, але непасрэдна гутарыць з ім не даводзілася. І вось аднойчы летнім прыгожым днём разам з групай творцаў – Антонам Бялевічам, Кастусём Кірэенкам, Янкам Брылём, Іванам Мележам, Анатолем Вялюгіным, Іванам Грамовічам, Аляксеем Русецкім – Іван Пятровіч Шамякін наведаў Якуба Коласа.

Канстанцін Міхайлавіч сустрэў гасцей у маладым садзе, які пасадзіў уласнымі рукамі. Адразу павёў глядзець жыта, пасеянае па метадзе Гваніна. Канстанцін Міхайлавіч з глыбокім веданнем справы расказваў пра жыта і сад. Дзень быў надзвычай спякотны. Прычым спёка трымалася ўжо трэці тыдзень, і Я. Коласа гэта хвалявала. Размова перайшла на ўраджай у рэспубліцы. Іван Пятровіч

пра пачатак сустрэчы ва ўспамінах "Сустрэчы з настаўнікам" занатаваў: "*Ідучы ў госці да Якуба Коласа, я ўяўляў, што ён адразу пачне размову пра літаратуру, пачне вучыць нас, як трэба пісаць. У маладога пісьменніка ёсць такі перыяд, калі праблемы чыста літаратурныя яго цікавяць больш, чым аснова літаратуры – праблемы жыцця. Магчыма, у мяне быў тады менавіта такі перыяд.*

Прызнаю шчыра, што спачатку я адчуваў некаторае расчараванне ад сустрэчы. Праходзіць паўгадзіны – размова пра жыта, яблыні, спёку, засуху; мінае гадзіна – Якуб Колас расказвае пра тое, што ён бачыў у вёсцы, куды два дні назад наведаўся, як там жывуць людзі, што яны гавораць, пра што думаюць…

Потым разважалі аб тым, чаму засыхаюць сосны тут, каля Акадэміі, і ў парку імя Чалюскінцаў" [2, с. 3].

Непрыкметна госці разам з гаспадаром перайшлі з саду на адкрытую веранду. Пачалася простая гутарка на розныя тэмы. Двума-трыма цікавымі сказамі ствараў Я. Колас характар чалавека, апісваў пэўную падзею. Потым расказвалі маладзейшыя пісьменнікі – Я. Брыль і А. Бялевіч, прыгадвалі розныя смешныя і не вельмі гісторыі з вясковага жыцця, здарэнні далёкага і блізкага мінулага, цікавых людзей. Канстанцін Міхайлавіч слухаў вельмі ўважліва, весела смяяўся – радаваўся таму, што ёсць у народзе такія цікавыя людзі, такія тыпы, а маладыя творцы здолелі ўбачыць іх і ўмеюць пра іх расказаць. Як успамінае Іван Шамякін, "*пад канец сустрэчы мне не хацелася ўжо размовы на спецыяльна літаратурныя тэмы. Я зразумеў: усё, што было сказана за час сустрэчы, не было выпадковасцю. Проста, без надакучлівых павучанняў Якуб Колас вучыў нас самаму галоўнаму: як пісьменнік павінен ставіцца да жыцця, да людзей*" [2, с. 4].

Больш сістэматычныя сустрэчы І. Шамякіна з Я. Коласам пачаліся праз год, калі Іван Пятровіч быў выбраны сакратаром партыйнай арганізацыі. Першы паход да Я. Коласа па партузносы адбыўся, калі беларускі класік трохі занядужаў, і малады сакратар быў вымушаны ісці да яго дадому: "*Я пайшоў. Набліжаўся да знаёмага дома з хваляваннем. Адна справа – прыйсці з групай сяброў, іншая – упершыню сустрэцца з паэтам адзін на адзін. Што скажу яму, каб гэта было разумна, дасціпна?*" [2, с. 4]. Атрымаўшы партузносы, Іван Пятровіч не ведаў, як развітацца. Аднак Канстанцін Міхайлавіч умела, проста, з веданнем справы перавёў гутарку на звычайныя побытавыя з'явы: сям'я, надвор'е, ураджай. Па словах І. Шамякіна, "*зніклі мая збянтэжанасць, скаванасць. Неяк сама сабой, за колькі хвілін, узнікла тая прастата і непасрэднасць адносін, якая збліжае людзей і робіць размову ўзаемна цікавай*" [2, с. 5]. А ў дзённіках "Роздум на апошнім перагоне" пра гэты першы паход чытаем наступнае: "*Ва ўспамінах я далікатна маніў, што Колас быў хворы, пра чалавека ў такім узросце заўсёды можна сказаць, што яму нядужыцца, ведаю па сабе. Усё астатняе – праўда: хваляванне маё, няведанне, пра што гаварыць (не быў я ў маладосці такім гаваруном, як цяпер). Ды і Колас быў з катэгорыі такіх жа маўчуноў. Праўда і тое, што стары і малады як бы ажывіліся і паразумеліся, калі на яго пытанне я адказаў, што ў мяне трое дзяцей. Мабыць, да таго паэт з псіхалогіяй селяніна прымаў мяне, як хлапчука, блазнюка, а тут прыняў як мужчыну, галаву сям'і, гаспадара. Тады знайшліся тэмы для размовы*" [1, с. 218 – 219]. Паразуменне захавалася і надалей. І. Шамякін наведваў Якуба Коласа кожны месяц на працягу чатырох гадоў і прыйшоў да высновы: "*Можа, тады я зразумеў, як трагічна адзінокі ён – пры ўсёй пашане начальства, калег*" [1, с. 219].

Успаміны "Сустрэчы з настаўнікам" І. Шамякіна былі надрукаваны ў часопісе "Полымя" (1960, № 5), зборніку публіцыстыкі "Размова з чытачом" (Мінск, 1973), зборніках успамінаў пра Якуба Коласа "Жыццё для народа" (Мінск, 1962) і "Успаміны пра Якуба Коласа" (Мінск, 1982). Аднак у апошняй кнізе не было канцоўкі: «*Напярэдадні адкрыцця Музея Якуба Коласа дырэктар музея Даніла Міцкевіч запрасіў групу пісьменнікаў агледзець экспазіцыю, зрабіць заўвагі па афармленню. З хваляваннем уваходзілі мы ў знаёмы дом, дзе кожная прыступка на лесвіцы і кожная рэч напамінала пра настаўніка. Здаецца, зусім нядаўна многія з нас сядзелі ў гэтым кабінеце, дзе ўсё асталося ў такім жа выглядзе, як пры жыцці паэта. На стале ляжыць недапісанае пісьмо Я. С. Мазалькову. Канстанцін Міхайлавіч пісаў гэтае пісьмо за колькі хвілін да раптоўнай смерці. Яно абрываецца фразай: "Не магу я, на жаль, хворай рукой адгукнуцца на ўсе сусветныя падзеі, якія ў наш век набываюць усе сто працэнтаў…". (Перад гэтым Канстанцін Міхайлавіч пісаў, што ён толькі на 50 працэнтаў паэт, а на другія 50 працэнтаў – грамадскі дзеяч. Між іншым, працэнты гэтыя так і напісаны – лічбамі).*

А ў той зале, дзе змяшчае экспазіцыю музей, многія з нас не раз сядзелі за гасцінным сталом, прагна слухаючы разумныя, дасціпныя, сур'ёзныя і вясёлыя словы гаспадара.

Мы агледзелі экспазіцыю разам з мастакамі, якія нямала папрацавалі, каб афарміць музей, паказаць творчы шлях Якуба Коласа і вобразы роднай прыроды і людзей, што створаны яго геніем.

Але асобныя работы мастакоў не спадабаліся нам. Янка Скрыган, Пятро Глебка і я выказалі свае заўвагі па карцінах Я. Красоўскага "Кастусь Міцкевіч запісвае народную казку", П. Раманоўскага "З дзядзькам на рыбу", А. Малішэўскага "Дзядзька Антось з дзецьмі", І. Ахрэмчыка "Першая сустрэча" (сустрэча Я. Коласа з Максімам Горкім у Негарэлым).

Мастакі не згадзіліся. Пакрыўдзіліся. Пачалі даказваць, што мы не разумеем жывапісу, што глядзім на карціны з нейкіх сваіх, вузка прафесійных пазіцый.

Я пасля думаў пра гэтую спрэчку. Двойчы хадзіў глядзець карціны. Не, мы не хацелі пакрыўдзіць нашых сяброў-жывапісцаў: яны працавалі добрасумленна. Але я перакананы, што мелі рацыю ўсё-такі пісьменнікі. Законы мастацтва амаль аднолькавыя, усё залежыць ад крытэрыя, з якім падыходзіць да ацэнкі твораў. Не будзе самавыхваленнем, калі я скажу, што, відаць, мы часцей сустракаліся з Коласам, лепш ведалі яго асабіста і глыбей ведаем яго творчасць. Гэта зусім натуральна. І безумоўна, што ў доме, дзе ён жыў, працаваў, у яго музеі, экспанаты якога павінны адлюстроўваць усю творчасць паэта праўдзіва і поўна, мы глядзелі на карціны вачамі яго, Мастака з вялікай літары, які праз усё жыццё быў надзвычай патрабавальны і да самога сябе і да ўсіх тых, хто прысвячаў сваё жыццё літаратуры і мастацтву. Нам хацелася, каб экспазіцыя музея не толькі расказвала пра Коласа, але і выхоўвала гэтую высокую патрабавальнасць ва ўсіх мастакоў – і слова, і пэндзаля, і сцэны. Ад Коласа пачынаецца іншы, непамерна больш высокі, крытэрый ацэнкі твораў не толькі ў літаратуры, але і ва ўсіх іншых галінах мастацтва. І пра гэта нельга забываць ні нам, пісьменнікам, ні мастакам, ні акцёрам, ні крытыкам.

Янка Купала і Якуб Колас – гэта тыя светлыя вышыні нацыянальнай свядомасці і народнага мастацтва, да ўзроўню якіх павінны імкнуцца ўсе, хто працуе для ўслаўлення ратнага і працоўнага подзвігу свайго народа» [3, с. 30 – 31].

Сёння цяжка сцвярджаць, па якой прычыне з апошніх выданняў быў зняты гэты ўрывак: або ён не задаволіў самога І. Шамякіна, або не дазваляў памер кніг. Трэба падумаць, можа, з цягам часу варта было б узнавіць прыведзены кавалак у асноўным тэксце.

Цытаваць, параўноўваць і аналізаваць успаміны "Сустрэчы з настаўнікам" і дзённікавыя запісы "Роздум на апошнім перагоне" можна доўга. Звернем увагу толькі яшчэ на тое, што дзённікавыя запісы І. Шамякіна пра Я. Коласа значна дапаўняюць раней напісаныя ўспаміны. Таму раім прачытаць як "Сустрэчы…", так і "Роздум…".

Напрыканцы хацелася б звярнуць увагу на тое, што калі ўспаміны "Сустрэчы з настаўнікам" заўсёды і поўнасцю задавальнялі старэйшага сына класіка Данілу Канстанцінавіча Міцкевіча, то некаторыя моманты з дзённікавых запісаў "Роздум на апошнім перагоне" Даніла Канстанцінавіч не прыняў і выказаў Івану Пятровічу незадавальненне. Так, папракнуў І. Шамякіна ў наступным: *"Ты пішаш, што ствараўся культ Коласа, дык я табе скажу, што ў Шамякіна быў большы культ. Колас быў толькі намеснікам Старшыні Вярхоўнага Савета (у каго? У непісьменнага Бельскага?), а Шамякін – Старшынёй. Колькі год? – Усяго 14. – Во! Усяго. Коласу не далі Героя, а табе далі. А вагон спецыяльны… дык усяго два разы ён і карыстаўся ім"* [1, с. 472]. Крытычныя заўвагі Д. Міцкевіч выказаў не толькі ў вуснай гутарцы, але і ў артыкуле "Не тыя сцежкі…" (Полымя), і ў кнізе "Любіць і помніць" (Мінск, 2000). Тут трэба адзначыць, што пісьменнікаў старшынямі Вярхоўнага Савета БССР пачалі прызначаць толькі з 1965 г.: Максім Танк (з 1965 да 1971 г.), І. Шамякін (з 1971 да 1985 г.), І. Навуменка (з 1985 да 1990 г.). А наконт звання Героя Сацыялістычнай Працы ўзнікае пытанне: ці быў хто з пісьменнікаў узнагароджаны ім да 1956 г.? Той жа К. Сіманаў, лаўрэат шасці Сталінскіх прэмій, атрымаў званне Героя Сацыялістычнай Працы толькі ў 1974 г. А звесткі пра вагон можна знайсці ў перапісцы самога Якуба Коласа. Для гэтага варта звярнуцца да дваццацітомнага Збору твораў пісьменніка. Але з цягам часу ўсе непаразуменні паміж І. Шамякіным і Д. Міцкевічам былі высветлены, і Даніла Канстанцінавіч пагадзіўся з тым, што пісаў пра Якуба Коласа І. Шамякін: *"Мы з Данілам паразумеліся, паспрачаліся. Падумаеш, праблема! Недакладнасці ці суб'ектывізм некаторых выказванняў пры глыбокай павазе да Коласа. <…> Ды гэта дробязі"* [1, с. 526].

У "Роздуме на апошнім перагоне" Іван Шамякін запісаў: *«У нас выпрацаваўся стэрэатып успамінаў, ад якога мы ніяк не можам адысці. Можа, не трэба так хутка пісаць іх, успаміны пра сваіх сучаснікаў – пра тых, хто яшчэ ўчора жыў побач з намі? Але бяда, што і пра класікаў мы пішам па такім жа трафарэце. Прыклад – шмат якія кнігі серыі "ЖЗЛ". Кніга Шклоўскага пра Талстога – ганьба, гэта здзек з вялікага сына Расіі. А вось Андрэ Маруа пра сваіх папярэднікаў, што з'яўляюцца гонарам не толькі Францыі – чалавецтва – пра Бальзака, Заля, Жорж Санд напісаў зусім інакш. У яго – яны людзі і ў той жа час – геніі. І гэта праўдзіва і цікава»* [1, с. 110]. З гэтымі словамі Івана Шамякіна можна поўнасцю пагадзіцца. І тут трэба таксама ўлічваць, што дзённікі "Роздум на апошнім перагоне" пісаліся ўжо сталым пісьменнікам, які імкнуўся паказаць Якуба Коласа не толькі класікам, тытанам беларускай літаратуры, але і простым чалавекам, каму ўласцівы, як і кожнаму чалавеку, пэўныя слабасці і недахопы. Ды і ўсякія ўспаміны, дзённікавыя запісы заўсёды нясуць пэўную долю суб'ектыўнасці ў ацэнцы тых ці іншых падзей і чалавечых якасцей.

Спіс літаратуры

1. **Шамякін, І. П.** Збор твораў : у 23 т. / І. П. Шамякін. – Мінск : Маст. літ., 2014. – Т. 22. – 815 с.

2. **Шамякін, І. П.** Збор твораў : у 23 т. / І. П. Шамякін. – Мінск : Маст. літ, 2014. – Т. 21. – 727 с.

3. **Шамякін, І. П.** Размова з чытачом : артыкулы, выступленні, дзённікі / І. П. Шамякін. – Мінск : Маст. літ., 1973. – 320 с.

Алеся ШАМЯКІНА.